**“Беларускі салавей”: урок па творчасці**
**Змітрака Бядулі**
**Пазакласнае мерапрыемства ў 8 класе**

**Н. В. Лучыц,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
Пінкавіцкай СШ імя Якуба Коласа
Пінскага раёна

**Мэты:**
- ушанаваць памяць выдатнага беларускага пісьменніка;
- выклікаць цікавасць да творчасці Змітрака Бядулі;
- стварыць умовы для выхавання павагі да творчасці беларускіх пісьменнікаў.

**Абсталяванне:** фотаздымкі, прысвечаныя з біяграфіі пісьменніка, відэаролікі, выстава кніг Змітрака Бядулі.

**Форма правядзення:** вусны часопіс.

**Ход мерапрыемства**

**I. Арганізацыйны момант**
**Прывітанне і абмеркаванне эпіграфа**



***Эпіграф:***
*На горне душы першы верш я каваў,*
*Мне молатам гора служыла;*
*Зык песні паўночнай у сэрцы хаваў,*
*І сэрца свой боль гаварыла...*
*Змітрок Бядуля.*

**II.Асноўная частка**
**1. Паведамленне тэмы і мэт мерапрыемства**

**Настаўнік.** Сённяшняе наша мерапрыемства прысвечана 135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі, выдатнага пачынальніка новай беларускай літаратуры. Сваёй дзейнасцю ён услsavіў беларускі народ, узбагаціў яго культуру і мастацтва.

**2. Кароткія звесткі з біяграфіі і творчай дзейнасці пісьменніка**

**Выступленні вучняў.** Змітрок Бядуля – гэта псеўданім пісьменніка. Сапраўднае яго імя – Самуіл Яфімавіч Плаўнік. Нарадзіўся 23 красавіка ў

1886 годзе ў мястэчку Пасадзец на Лагойшчыне. Сям’я не была забяспечанай, бацька не меў прафесіі. Ён працаваў то на возках лесу, то ў дробным гандлі. Маці зарабляла пашывам адзення, але гаспадарчыя клопаты амаль не пакідалі ёй часу.

Толькі дзед, Лейзар Рабіновіч, стабільна займаўся медніцтвам, быў “творцам прыгожых бліскучых пасудзін”. Маленькі Самуіл бавіў з ім час і ў кузні, і ў хаце. Дзед купіў яму азбуку і потым у гульні заахвочваў цікавасць да навучання. Але пазней на месца забавак прыйшлі пакуты.

У тыя часы здольных да граматы хлопчыкаў-іўдзеяў аддавалі найперш у пачатковую школу, а потым – у духоўную семінарыю. Але вучыцца там ён не змог, паспрабаваў збегчы.

Бацька накіраваў сына ў суседнюю школу. Калі Змітраку споўнілася 16 гадоў, ён стаў хатнім настаўнікам, а потым разам з бацькам рабіў у лесе. Першыя свае творы адправіў у газету “Наша ніва”, а потым сам стаў працаваць у газеце. Там ён сустрэўся з Янкам Купалам. Купала аб’яднаў раннія тэксты Бядулі пад назвай “Абразкі”.



З. Бядуля (справа)

У 1915 годзе, калі Вільня была акупавана немцамі падчас Першай сусветнай вайны, газета спыняе сваю дзейнасць. Бядуля вяртаецца дадому. Ён едзе ў Мінск.

Шлюбам ён абраўся, калі яму было больш за 40 гадоў. Нарадзіліся дачка Зоя і сын Яфім – апошні па сённяшні дзень жыве ў Мінску. Яму споўнілася 87 гадоў.





*Яфім Самуілавіч Плаўнік (нар. у 1934 г.)*
*Сын*

*З. Бядуля з жонкай Марыяй*

Бядуля застаўся ў Мінску амаль да канца жыцця. У яго ладзіліся новыя творчыя сувязі з Максімам Багдановічам, Якубам Коласам і іншымі пісьменнікамі. Пісьменнік уваходзіў у літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”, узначальваў дзіцячы часопіс “Зоркі”, а потым перайшоў у аб’яднанне “Узвышша”.

Туды ўваходзілі К.Чорны, У.Дубоўка, К.Крапіва, Я.Пушча і іншыя.



*Літаратурнае згуртаванне “Узвышша”.*
*З. Бядуля сярод таварышаў па пяру.*

Ён працягвае друкавацца. Пасля аповесці “Салавей” выпускае некалькі зборнікаў – “Дэлегатка” (1928), “Тры пальцы” (1930), “Дзесяць” (1930) і іншыя. Потым – раман у 2 частках “Язэп Крушынскі” (1929-1932).

Падарожнічае  на Каўказ, ва Украіну.

Пачынаецца Вялікая Айчынная вайна. Бядуля адпраўляецца ў эвакуацыю з сям’ёй. 3 лістапада 1941 года, па дарозе ў цягніку памірае.

У вёсцы Даўгінава Вілейскага раёна, дзе пісьменнік на працягу 1898 – 1899 наведваў яўрэйскую духоўную семінарыю, зараз стаіць мемарыяльная пліта.



Імя Змітрака Бядулі прысвоена школе на яго радзіме – у вёсцы Пасадзец. Яго імем названы вуліцы ў гарадах Беларусі.

**3. Дэманстрацыя відэаролікаў “Да дня нараджэння Змітрака Бядулі”, “Успамінаем Змітрака Бядулю разам з яго сынам Яфімам Плаўнікам”**

**4.Выстава твораў пісьменніка**

*Дзеці знаёмяцца з творамі пісьменніка, даюць каментарыі да іх.*




*Тэматыка творчасці Змітрака Бядулі*

**Настаўнік.** Старонкі аповесці Змітрака Бядулі (1886-1941) “Салавей” вяртаюць нас у мінулае нашай Бацькаўшчыны. Пісьменнік гістарычна праўдзіва намаляваў карціну жыцця сялянства ў тую змрочную пару – у час прыгону: звярыную жорсткасць паноў, іх пагарду да ўсяго беларускага – да імен, да мовы, да нацыянальнай культуры. Але ніякія катаванні не маглі заглушыць народныя таленты, прыгажосць душы народа.

Пакуты герояў аповесці выклікаюць боль, але яго перамагае пачуццё зачаравання іх чалавечнасцю, самаадданасцю і высакародствам. Канкрэтны жыццёвы матэрыял, асабіста перажытае і ўбачанае ляглі таксама ў аснову апавяданняў “Малыя дрывасекі”, “Пяць лыжак заціркі”… і іншыя.

**5. Чытанне па ролях апавядання “Пяць лыжак заціркі”**

**Настаўнік.** Пісьменнік пісаў пра цяжкае жыццё народа. Гэта адлюстроўваецца ў апавяданні “Пяць лыжак заціркі”. Тут адчуваецца пратэст пісьменніка супраць бязрадаснага дзяцінства і сацыяльна-грамадскіх умоў, якія пазбаўляюць дзяцей шчасця.

**6. Інсцэніроўка апавядання “На Каляды к сыну”**

**Настаўнік.** Пісьменніка хвалюе праблема інтэлігенцыі і народа, і гэтую праблему ён паказвае ў апавяданні “На Каляды к сыну”.

**7. Выразнае чытанне ўрыўка з казкі “Мурашка-Палашка”**

**Настаўнік.** Шмат казак пісаў Змітрок Бядуля для дзяцей: “Сярэбраная табакерка”, “Мурашка-Палашка” і іншыя. У казцы Змітрака Бядулі раскрываецца тэма калектыўнай працы, неабходнасці абароны свайго дому. Дабро ў казцы звязана з вобразам Палашкі. Зло – у вобразе мядзведзя. Ён дужы і самаўпэўнены, ён гвалтаўнік-прыгнятальнік. Адмоўныя героі і воўк з лісой, яны прыслужваюць прыгнятальніку працоўных. Мурашкі – працавітыя, воўк – жорсткі, ліса – хітрая.

**III. Заключэнне**

**Настаўнік.** Алесь Марціновіч сказаў пра Змітрака Бядулю такія словы: *(увага на дошку)*:“Далёка не многія пісьменнікі-беларусы так глыбока спасціглі душу свайго народ, як Змітрок Бядуля, яўрэй па нацыянальнасці, за што яму вялікая ўдзячнасць. Ягоны заклік: «Будзь сам сабой, беларус…» – крэда для ўсіх, хто ўспрымае сябе сапраўдным сынам ці дачкой сваёй Бацькаўшчыны”.

Прыйшоў час нам развітацца з вамі. Да новых сустрэч!

## Літаратура


1. Беларуская літаратура ў 7 класе: дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул.сярэдн.адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Сэр-Віт, 2007. – 336 с.
2. Відэаролік “Да Дня нараджэння Змітрака Бядулі” https://www.youtube.com/watch?v=nXHyowsv0dY .
3. Відэаролік “Успамінаем Змітрака Бядулю разам з яго сынам Яфімам Плаўнікам” https://www.youtube.com/watch?v=XUFhoYrHmD0 .